***Бандарэнка Канстанцін Міхайлавіч** — рэктар Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*



Разглядаючы метадалогію гісторыі як сукупнасць прыёмаў даследавання мінулага і вучэнне пра метады і спосабы прымянення навуковых светапоглядных прынцыпаў да працэсу тэарэтычнага пазнання і практычнай дзейнасці навукоўцаў, выкладчыкаў і настаўнікаў, хачу спыніцца на некаторых аспектах **узаемаадносін метадалогіі і дзяржаўнай ідэалогіі**.

Як і любая незалежная краіна, Рэспубліка Беларусь мае свае дзяржаўныя інтарэсы, якія адлюстроўваюць гістарычныя традыцыі, яе ўнутранае і знешняе становішча, імкненне да стабільнага развіцця ў супольнасці іншых дзяржаў, і асабліва з дзяржавамі-суседзямі. Таму **задачай метадалогіі гісторыі** з'яўляецца выпрацоўка навуковаабгрунтаваных рэкамендацый для вызначэння пэўных стандартаў інтэрпрэтацыі гістарычнага мінулага Беларусі, якія адпавядаюць доўгатэрміновым інтарэсам беларускай дзяржавы. Менавіта на такіх стандартах і павінна базіравацца канцэпцыя гістарычнай навукі і гістарычнай адукацыі. Безумоўна, могуць быць розныя тлумачэнні фактаў, падзей і працэсаў, але яны павінны разглядацца як прыватны пункт гледжання навукоўца ці журналіста, абмяркоўвацца на пасяджэннях кафедраў ВНУ, аддзелаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі, на навуковых канферэнцыях, у СМІ, а не адразу ж змяшчацца ў падручніках і дапаможніках.

**Дзяржаўныя стандарты** асвятлення нацыянальнай гісторыі грунтуюцца на пэўнай парадыгме нацыянальнай гісторыі, якая абапіраецца на сістэму пастаянных палажэнняў — канстант. Яны існуюць да таго часу, пакуль існуе сама парадыгма. У сучаснай беларускай гістарычнай навуцы такіх дакладна вызначаных стандартаў гістарычных інтэрпрэтацый пакуль што няма.

У сувязі з гэтым хачу выказаць некаторыя меркаванні, іх падзяляюць усе навукоўцы кафедраў гуманітарных навук нашага універсітэта.

Пры распрацоўцы канцэпцыі гістарычнай навукі і гістарычнай адукацыі нам неабходна зыходзіць з пастулатаў, што Рэспубліка Беларусь — поліэтнічная і шматканфесіянальная дзяржава. Дасягнуць духоўнага адзінства ўсяго грамадства ў такой сітуацыі можна толькі ў гістарычнай перспектыве. Аднак неабходна імкнуцца да выпрацоўкі пэўных правіл палітычнага і сацыякультурнага дыялога. Увесці такія правілы якімсьці дэкрэтам немагчыма. Яны павінны быць прыняты добраахвотна. Дзяржаўная ўлада можа толькі садзейнічаць гэтаму працэсу. Такія неафіцыйныя правілы існуюць у кожным стабільным грамадстве і выконваюцца ўсімі ўдзельнікамі дыялога. У іх ёсць адзін агульны інтарэс — існаванне і дабрабыт сваёй краіны і нацыі, што і стварае сутнасць любой нацыянальнай ідэі. **Барацьба за незалежную моцную і квітнеючую Беларусь — вось галоўная сутнасць нашай нацыянальнай ідэі на сучасным этапе развіцця.**

Нацыянальная ідэя павінна грунтавацца на пачуццях нацыянальнай годнасці і нацыянальнай самапавагі ўсяго грамадства. Таму для правільнага ўсведамлення нашай гісторыі **неабходна аб'ектыўная нацыянальная самакрытыка**. У кожнага народа, нацыі, этнасу ў мінулым і сучасным было і ёсць тое, чым ён можа па праву ганарыцца, як і тое, чаго варта саромецца. Ёсць перыяды духоўнага і эканамічнага ўздыму, былі і часы эканамічных крызісаў, духоўнай і маральнай дэградацыі.

Беларуская гістарычная навука сёння перажывае складаны перыяд свайго развіцця. Па-ранейшаму працягваецца процiборства розных палітычных сіл як унутры краіны, так і ціск з замежжа. У такіх абставінах дзяржаўнае кіраўніцтва праводзіць абгрунтаваную і ўзважаную палітыку па развіцці гістарычнай навукі, стварэнню падручнікаў і дапаможнікаў для ВНУ і агульнаадукацыйных устаноў. Пры падрыхтоўцы іх **вельмі важна пазбягаць крайнасцей** пры асвятленні падзей і з'яў сусветнай і айчыннай гісторыі, вывучаць і выкладаць гісторыю ўзважана і аб'ектыўна.

Хачу акцэнтаваць увагу на некаторых ненавуковых, на наш погляд, метадычных падыходах да вывучэння і асвятлення гістарычнага мінулага Беларусі, якія знайшлі даволі шырокае распаўсюджанне ў айчыннай і беларускай замежнай гістарыяграфіі.

Звернемся да часу фарміравання парадыгмы беларускай гісторыі, якая пачала складвацца ў другой палове XIX ст. на грунце непрымірымага супрацьстаяння польска-каталіцкага і руска-праваслаўнага

цывілізацыйных падыходаў. У такой сітуацыі адзінай парадыгмы не магло ўзнікнуць. Адпаведна з’явіліся **дзве парадыгмы: праваслаўная (дзяржаўная) і каталіцкая (апазіцыйная ёй).** Зазначу, што размова ідзе пра каталіцызм і праваслаўе як рэлігійныя канфесіі. Каталікі і праваслаўныя прадстаўляюць культурна-цывілізацыйныя падсістэмы адной еўрапейскай культуры і цывілізацыі. Сучасны еўрапеец можа спавядаць любое веравызнанне або быць атэістам, але ўсё роўна ён аб’ектыўна належыць або да заходнееўрапейскай, або ўсходнееўрапейскай падсістэмы.

На **культурна-цывілізацыйнай праваслаўнай аснове** склалася адзіная народнасць і адзінае дзяржаўнае аб’яднанне — Русь. Менавіта ўсходняе хрысціянства — праваслаўе з’яўляецца агульнай матрыцай для велікарусаў, маларусаў і беларусаў. На ёй жа пасля палітычнага размежавання Русі фарміраваўся і беларускі этнас. Гэта неабвержны факт.

Рашаючай прычынай абасаблення заходніх груп старажытнарускай супольнасці і фарміравання асобных беларускай і ўкраінскай народнасцей сталі знешнія фактары, перш за ўсё татара-мангольскае нашэсце і палітычнае расчляненне Рускай зямлі.

Уласна беларускі этнас пачаў фарміравацца ў межах Вялікага княства Літоўскага. Аднак літоўская язычніцкая знаць імкнулася захаваць сваё прывілеяванае становішча ў дзяржаве, большую частку тэрыторыі якой засялялі праваслаўныя славяне, таму прыняла каталіцтва. Большасць каталіцкага духавенства ў ВКЛ складалі выхадцы з польскіх зямель. Разам з каталіцтвам прыйшлі польская культура і польская мова. Такім чынам, з пранікненнем каталіцызму пачалася паланізацыя язычніцкай феадальнай вярхушкі ВКЛ, спачатку літоўскай, а затым і славянскай. З прыняццем Брэсцкай уніі ў 1596 г. на працягу двух стагоддзяў вялося насаджэнне уніяцтва. У выніку праваслаўная беларуская народнасць страціла свой верхні цывілізаваны сацыяльны слой, а яе прадстаўнікі, перш за ўсё магнаты (Радзівілы, Сапегі, Агінскія інш.), імкнуліся стаць арганічнай часткай польскай шляхецкай нацыі. Беларускі народ і беларуская шляхта апынуліся ў двух цывілізацыйных лагерах. Толькі ўваходжанне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі, пры ўсёй неадназначнасці гэтага працэсу, выратавала беларускі народ ад дэнацыяналізацыі.

**Каталіцкая парадыгма гістарычнага развіцця** беларускіх зямель узнікла ў асяроддзі выхадцаў з апалячанай шляхты і з самага пачатку была штучнай прапагандысцкай канструкцыяй, якая не пацвярджаецца гістарычнымі крыніцамі. Яна адмаўляе агульнае паходжанне сучасных усходнеславянскіх народаў з адзінай старажытнарускай этнічнай супольнасці, аб’яўляе старажытнарускую народнасць ніколі не існаваўшай. Паходжанне беларусаў выводзіцца непасрэдна са славянскіх плямянных саюзаў, якія размяшчаліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі, перш за ўсё крывічоў. Такім чынам, адмаўляецца існаванне агульнай для ўсіх усходніх славян дзяржавы — Русі, Рускай зямлі. Старажытнарускія княствы падаюцца як самастойныя дзяржавы, а княствы на тэрыторыі Беларусі, перш за ўсё Полацкае, як першыя беларускія дзяржавы. Міжкняжацкія ўсобіцы трактуюцца як войны паміж дзяржавамі.

У падобных інтэрпрэтацыях асвятляецца і далейшая гісторыя беларускіх зямель. Беларусь паказваецца як частка заходняй культурна-цывілізацыйнай сістэмы і супрацьпастаўляецца ў культурных адносінах іншым усходнім славянам. Вялікае княства Літоўскае называецца “беларускай дзяржавай”. Так яно называецца і пасля прыняцця літоўскай княжацкай дынастыяй каталіцтва і ўступлення ў унію з Польшчай і нават пасля зліцця Польшчы і ВКЛ у адзіную дзяржаву — Рэч Паспалітую. Становішча беларусаў у складзе ВКЛ і Рэчы Паспалітай ідэалізуецца. Галоўным гістарычным ворагам Беларусі аб’яўляецца Расія, якая быццам бы ва ўсім чужая беларусам і імкнецца праглынуць і “русіфікаваць” іх.

Безумоўна, плюралізму думак у гістарычнай навуцы немагчыма пазбегнуць і да гэтага не трэба імкнуцца. Аднак пры выкладанні гісторыі ў агульнаадукацыйнай школе, асабліва ў малодшых і сярэдніх класах, розныя тлумачэнні гістарычнага мінулага могуць згубна ўплываць на фарміраванне свядомасці дзяцей і падлеткаў. **Гістарычная адукацыя павінна мець агульнадзяржаўныя стандарты, якімі неабходна кіравацца**. У адпаведнасці з навуковай канцэпцыяй гістарычнай адукацыі павінны быць унесены карэктывы ў школьныя праграмы і падручнікі, якія дзейнічаюць сёння.

Пэўныя напрацоўкі ўжо ёсць. Дацэнтам нашага універсітэта Я.І.Трашчанком быў падрыхтаваны праект “К вопросу об общей концепции историческо го образования в Республике Беларусь”. Ён абмяр коўваўся на спецыяльна скліканай Міністэрствам адукацыі нарадзе загадчыкаў кафедраў гісторы якая адбылася на базе гістарычнага факультэта Ма гілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшо ва ў кастрычніку 2002 г. У цэлым праект быў падтры маны, аднак далейшага развіцця не атрымаў.

На наш погляд, неабходна працягваць гэту ра боту, **стварыць аўтарытэтную камісію**, у скла якой неабходна ўключыць навукоўцаў, выкладчыка метадыстаў і настаўнікаў, а таксама філосафаў, псіхо лагаў. Пасля таго як дзяржаўныя стандарты будуц распрацаваны, абмеркаваны з удзелам шырокай гра мадскасці і дапрацаваны з улікам заўваг, яны павін ны быць зацверджаны дзяржаўнымі органамі і стац абавязковымі для ўсіх навуковых і адукацыйны установ і дзяржаўных сродкаў масавай інфармацы

Такім чынам, распрацоўка дзяржаўных стандар таў і агульнай канцэпцыі гістарычнай адукацыі ў Рэс публіцы Беларусь з’яўляецца адной з найбольш на дзённых задач, якія стаяць перад Міністэрствам аду кацыі і іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі. Прыняц це канцэпцыі дапаможа навукоўцам-гісторыкам вызначэнні асноўных прыярытэтаў пры выбары тэ навуковых даследаванняў, што, безумоўна, павысі ролю гісторыі ў распрацоўцы пытанняў ідэалогіі бе ларускай дзяржавы, павялічыць адказнасць супра цоўнікаў СМІ за матэрыялы, якія друкуюцца.

*(Працяг будзе*